**БРАЦКАЯ МАГІЛА**
**(СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. ПЛІСА)**



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле [дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь]): 613Д000584**

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Пліса, каля вуліцы імя Копцева

**Каардынаты:** 54.038570, 28.200836

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Пліса Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. Знаходзіцца на паўднёвай ускраіне вёскі каля чыгуначнага пункта "Чырвоны Сцяг". У 1950 г. на магіле пастаўлен помнік. Пахавана 87 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Пліса Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000584**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Знаходзіцца на паўднёвай ускраіне вёскі каля чыгуначнага пункта "Чырвоны Сцяг". У 1950 г. на магіле пастаўлен помнік, які выкананы з чорнага граніту. Абапал яго на бетоннай падставе – гранітная пліта, дзе выбіты імёны загінуўшых воінаў. З другога боку – брацкая магіла партызан з надмагільнай плітой, на якой выбіты імёны загінуўшых. Ёсць жалезная агароджа.

У 1975 г. выканком сельсавета ў гонар баявой дзейнасці падпольшчыкаў устанавіў мемарыяльную дошку на ўшанаванне памяці лейтынанта С. Копцева і іншых байцоў яго дывізіёна, якія загінулі ў няроўным баю з гітлераўцамі.

У брацкай магіле пахавана 87 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – лейтэнант Сяргей Копцеў.

Нарадзіўся Сяргей Копцеў у 1918 г. ў г. Мурам Уладзімірскай вобласці. Закончыў Горкаўскае артылерыйскае вучылішча. Вясной 1941 г. прыбыў у 479-ы зенітны артылерыйскі полк.

У сярэдзіне чэрвеня 1941 г. зенітнае падраздзяленне, у якім служыў Копцеў, выехала на вучэбна-трэніровачныя стрэльбы ў Крупкі, дзе і застала яго вайна. Падраздяленне тэрмінова пагрузілася на чыгуначныя платформы, і эшалон накіраваўся ў бок Мінска на злучэнне з палком. Спынілі на станцыі "Чырвоны Сцяг". Увечары 26 чэрвеня станцыю, на якой сабралася некалькі эшалонаў, бамбілі варожыя самалёты. У вагонах былі воіны, сем'і ваеннаслужачых, абсталяванне для эвакуацыі на ўсход. Жудасны малюнак быў пасля бамбёжкі: гарэлі вагоны, па вёсцы ішлі раненыя. Яны заходзілі ў дамы, жыхары давалі ім піць, кармілі, дапамагалі чым маглі. Раптам пачуўся гул на дарозе Смалявічы – Пліса, што пралягае ўздоўж чыгункі. Ён нарастаў – на ўзгорку з'явіліся варожныя танкі. Гэта быў фашысцкі дэсант.

З ходу танкі і пяхота пачалі абстрэльваць станцыю. У адказ па ворагу ўдарылі кулямётчыкі і бранябойшчыкі. Немцы спынілі агонь і адышлі прыкладка на кіламетр. Стала зразумела, што яны выбіраюць зручную пазіцыю, каб зноў пачаць бой. Настала ноч. Абаронцаў заставалася няшмат. У час бою загінулі многія байцы. Астатнія не пакінулі эшалона і рыхтаваліся да адбіцця новых варожых атак. Вырашылі страляць па фашыстах з зенітак. Шансаў на поспех было мала. Як-ніяк былі на віду, на адкрытых платформах. Разгарнулі зенітныя гарматы, замацавалі іх канатамі. Падрыхтоўкай да бою кіраваў лейтынант Сяргей Копцеў, яму дапамагалі намеснік палітрука Дарджыеў, сяржанты Сапрыкін, Акімаў, частка байцоў.

Прыкладна ў чатыры гадзіны раніцы немцы адкрылі ўраганны агонь па станцыі. Зенітчыкі пачалі біць у адказ прамой наводкай. Праз некаторы час над станцыяй стаў кружыць самалёт, які скінуў асвятляльныя ракеты. Нашы байцы працягвалі бой, знішчалі два танкі, але гінулі і самі.

Тры гадзіны ішоў жорсткі бой. Вораг не змог прарвацца наперад. У жывых засталіся Копцеў, Дарджыеў, Сапрыкін. Лейтынат наводзіў гармату, а таварышчы падавалі снарады. Вось падбілі адзін танк. Другі, трэці, запалаў чацвёрты. Калі Копцева параніла разрыўной куляй у нагу, ён працягваў змагацца. Танкавы дэсант быў разбіты. Ад ранення Копцеў страціў прытомнасць. Патрэбна была медыцынская дапамога. Знайшлі бінты, перавязалі рану і панеслі лейтынанта ў пасёлак Чарніцкі за 5 кілометраў да станцыі, у бальніцу.

Выратаваныя эшалоны пасля рамонту чыгункі пайшлі на ўсход. З боку Барысава ішлі паязды насустрач. Рух быў адноўлены.

У бальніцы Сяргей на кароткі час апрытомнеў. Ён спытаў: “Дзе нашы?” – паціснуў Дарджыеву  руку і памёр. Недалёка ад бальніцы яго пахавалі. Сяргей пражыў усяго 23 гады. Гэта быў яго першы і апошні бой у жыцці.

Вынікі бою бачылі камсамольцы в. Пліса Аляксандр Савіцкі, Анатоль Шымановіч, Мікалай Ляшкевіч, Пётр Цхановіч, Мікалай Жылко. Хлопцы сабралі зброю, занеслі ў лес. Вырашылі: змагацца з фашыстамі, як лейтынат Копцеў. Так у Плісе была створана падпольная камсамольска-маладзёжная група на чале з Аляксандрам Савіцкім, які па-геройску загінуў у 1944 г.

Пасля вайны выканком Пліскага сельсавета адшукаў родных Копцева – маці Ганну Іванаўну, яго брата, сястру, пляменніка. Адгукнуўся і Джарджыеў, які працаваў дырэктам школы ў г.Эліста ў Калмыкіі.

У 1965 г. астанкі Копцева былі перапахаваны каля станцыі Чырвоны Сцяг, там, дзе ішоў бой. Побач знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў, што загінулі ў барацьбе з намецка-фашысцкімі захопнікамі. На магіле пастаўлены помнік. Вуліца ў в. Пліса носіць імя лейтынанта Копцева.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Андрушчэнка, Н. К. Дарогамі подзвігаў. Помнікі і памятныя мясціны рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы на Міншчыне / Н. К. Андрушчанка. – Мн. : Беларусь, 1978. – 204 с.

2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

4. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.